**Дзяржаўная установа адукацыі**
**“Рамязоўскі яслі-сад - сярэдняя школа Ельскага раёна”**

Трошка Людміла Фадзееўна, настаўнік гісторыі

# Фальклорнае свята “Восеньскі кірмаш”

## Выкарыстанне музейнай педагогікі ў выхаваўчым працэсе






**Задачы:**
- раскрыць прыгажосць працы людзей на вёсцы;
- знаёмства з народнымі гульнямі, танцамі, песнямі, загадкамі;
- выхоўваць пачуццё гаспадара сваёй зямлі;
- выхоўваць  культуру паводзін.

Зала ўпрыгожана ў беларускім стылі паводле пары года, падрыхтавана выстава дароў восеньскага ўраджаю. Выкарыстаны экспанаты музея этнаграфічнага аддзела. На мерапрыемства запрошаны госці: бацькі, Трошка Наталля Міхайлаўна, намеснікі дырэктара па выхаваўчай рабоце.




**Вядучы**. Што за люд у нас сабраўся –
Нібы пляц шырэй раздаўся.
На якое свята нас
Запрашае восень у гэты час?

**Дзеці**. На кірмаш!

**Вядучы.** Сонца яркае ўстае,
На кірмаш народ ідзе.
Надышоў вясёлы час,
Завітаў кірмаш да нас.

Усіх, хто не ленаваўся,
Добра справаю займаўся
І не трапіў марна час,
Запрашаем на кірмаш!
Гэй, музыкі, дружна грайце
І кірмаш наш адкрывайце!

(Гучыць беларуская народная мелодыя)

**Вядучы**. Плённай працай, ураджаем
Усіх прысутных мы вітаем,
На кірмаш наш запрашаем!
Тут не толькі
Прадаюць, купляюць.
Спяшайцеся на кірмаш,
Гульнямі, песнямі парадуйце нас!

**Танец "Трасуха"**

**Жытнёвы каласок**. Добры дзень, шаноўны люд!
Каласок жытнёвы тут як тут!
Бачу народу багата –
Пэўна ж, тут нейкае свята?
А ўбор мой срэбны, не новы.
А хлеб мой просты, жытнёвы!
Жытнёвы хлеб - усяму галава.
Без хлебе і хата - не хата,
І свята - не свята,
І поле - не поле,
І доля - не доля!

Жытнёвы каласок. А зараз для парадку загадаю вам загадку: " Сто братоў адным поясам перавязаны". Што гэта?

**Дзеці**. Сноп.
(Каласок бярэ сноп і дорыць вядучаму.)
**Вядучы**. Дзякуй табе, каласок! Сноп жытнёвы, прасяны, Кланяемся табе да зямлі. (Ставіць сноп.)
**Вядучы**. А хто другую адгадае загадку?
Хто скажа, хто знае:
Што ў нашым краі
Другім хлебам называюць?
Слухачы і гледачы,
Здагадаўся - не маўчы!
**Вядучы**. Правільна!
Гэта бульбінка-беларусачка,
Пекная паненачка, шэрая сукеначка, зялёная хустачка!
(З'яўляюцца Бульбінкі.)
**Бульбінкі**.
Мы сяброўкі - рассыпушачкі,
Мы вясёлыя таўстушачкі.
Усе ў полі нарадзіліся,
Пагасціць да вас з'явіліся.
Вось якія мы паненачкі,
У нас шэрыя сукеначкі,
У Беларусі нарадзіліся,
Пагасціць да вас з'явіліся.
**Вядучы**. Дарагія глядачы,
Трэба тут дапамагчы.
Хай той запляскае ў ладкі,
Хто любіць з бульбы аладкі.
Раз-два-тры-чатыры-пяць!

Будзем бульбінку вітаць!

**Танец " Бульбачкі"** - .

**Вядучы.** Дзякуй вам, хлопчыкі і дзяўчынкі, якія вы ўсе малайчынкі!

**Гульня з бульбай** (трымаюць бульбу ілбамі)

**Сцэнка "Дзед і шляхціч"**

У дзеда ў руках сетка з буракамі

Дзед. Ой, куды ж гэта я трапіў? Га? Чаго гэта вы тут? Ой, ёй – ёй! Колькі народу! Свята нейкае?! А я вось тут ішоў… Ну, дык гэта, ішоў я.. А куды ж я ішоў? Да жонкі? Да жонкі я не ішоў! На работу? Таксама не ішоў. Да цёшчы? Не-а! да цёшчы я таксама не мог ісці. Чэша патыліцу, убачыў у руцэ буракі.

- А – мае родненькія! Успомніў! На кірмаш я ішоў!

Выходзіць шляхціч і напявае "Малады і не жанаты давядзі мяне да хаты…"

Дзед. Гэй, мужык!

Шляхціч. Што гаворыць гэты смерд? Ты што пся крэў, зусім здурнеў, што не бачыш з кім гаворыш?

Дзед. Як гэта з кім? З табою, мужык!

Шляхціч. Зноў мужык! Вочы у жменю вазьмі. Шляхціц я, зразумеў?

Дзед. Ну то, а як жа. Зразумеў! Шляхціч! Гэта мы ведаем. Мы мо таксама адтуль. Ты мне вось што лепш скажы, мужык, як мне на выставу свае буракі прыстроіць?

Шляхціч. Ты што, брыдота, здзекі нада мною чыніць уздумаў? Колькі раз табе казаць, не мужык я, не мужык! Шляхціч, разумееш, шляхціч! У гэты час выходзіць прыстаў.

Прыстаў. Хм. Дзед і шляхціч палохаюцца. Так-с! ну вось папаліся, мае даражэнькія! Грозна. Што за крык?

Дзед. Дык іць во, буракі!

Прыст. Маўчаць! Я вас пытаю!

Шляхціч. О! Пан начальнік! Справа ў тым, што я надумаў жаніцца.

Прыстаў. Што?

Шляхціч. Ну, пан жа начальнік, ведае, што сёння ў школе Рамязоўскай кірмаш. Вось я і выбраўся сюды, сябе паказаць, ну і на дзяўчат прыгожых і працавітых паглядзець. Мая бабка, царства ёй нябеснае, казала: "Панасю!" гэта імя маё

"Панасю! І хто ж за цябе пойдзе?"

Прыстаў. Ну і што?

Шляхціч. А тое, што пан начальнік, я тут не проста праходжваюся, а выбіраю пачастунак. Як куплю смачных яблыкаў ці грушаў, дык любая за мяне не толькі пойдзе, а паляціць.

Дзед. Во! Мужык! Купі ў мяне буракі.

Прыстаў. І што далей?

Шляхціч. А далей тое, што пан начальнік і сам бачыў. Іду я сабе, нікога не чапаю, пекнай панне пачастунак выбіраю. А вось тут гэты, нават не ведаю, як і сказаць, мяне называе мужыком. А які ж я мужык, пан начальнік, то ж абраза якая.

Прыстаў. А хто ты?

Шляхціч. Крыўдзіце, пан начальнік! Чысцейшай вады шляхціч я.

Прыстаў. Так! І сапраўды шляхціч! Ну што ж… Мы, як твар улады, пастанаўляем: табе, шляхціч, ісці купляць сабе яблыкі.

Шляхціч. Ды не, пан начальнік…

Прыстаў. Ну, а зараз з табою…Чуецца музыка А ну, гэць адсюль, зараз школьныя артысты выступаць будуць. Проша, проша артыстам. Гледачам: "Каб парадак быў"!

**Песня.**

**Гаспадыні**. Смялей падыходзьце, Тавар выбірайце. Таргуйцеся з намі,

А потым купляйце!
Бульба, цыбуля,
Ды з поўдню дыня –
Усё табе, гаспадыня!
Калачы ды булачкі,
Крэндзялі ды бублічкі!
А вось бліны, Ну і бліны,
Лезуць самі ў рот яны!
Пакаштуеш бліна з макам,
Прыглынеш язык ад смаку!
Калі хочаш што ўзяць,
Трэба песню праспяваць,
Верш пачытаць,
Альбо танец станцаваць.
Ну, выходзь, хто смелы з вас.
Пра наш кірмаш!

**Сцэнка "Дзед і баба"**

Выходзіць баба, цягне дзеда за рукаў. Дзед азіраецца, баба злуецца.

**Баба**. Ну чаго ты, стары дурань, утаропіўся туды? Ці ж ты людзей не бачыў? Пайшлі хутчэй, а то зараз свята скончыцца. Унь, бачыш, колькі людзей сядзяць? Чаго сядзяць? Зараз разбяруць усё. Што мы тады рабіць будзем?

**Дзед.** А што ж зробіш? Нічога і не зробіш.

**Баба**. Во! Ці бачылі вы, людцы, гэтую варону? Нічога яму не патрэбна: ні бульбы, ні капусты. Усяго ў яго хапае. Вось жа дурань стары! Толькі б на маладых дзяўчат пяліцца!

**Дзед**. Да ты што, старая, зусім з глузду з’ехала? Якія дзяўчаты?

**Баба**. Ведаю, ведаю якія. Дзяўчаты яму патрэбны, стары пень. Пайшлі лепш хутчэй. Вунь там, мабыць прадаецца нешта. Грошы рыхтуй.

**Дзед**. Зараз знайду (шукае і не можа знайсці).

**Баба**. Што? Няма? Згубіў? Ой людцы! Абакралі! Каравул! Выходзіць Прыстаў, дзед шукае грошы.

**Прыстаў**. У чым справа? Што за гвалт?

**Баба**. Ой, бяда, панічок, абакралі, усе грошы з кашальком у гэтага старога пня забралі.

**Прыстаў.** Ціха, ціха, разбяромся! Дык дзе былі грошы?

**Баба**. У яго.

**Дзед**. Знайшоў! Знайшоў!

**Баба**. Ах, божачкі, давай сюды.

**Прыстаў**. Ну, вось і ўладзілі. Ідзіце, ідзіце, бо да нас зноў артысты з песнямі ідуць.

**(Гучыць народная музыка. Вядучы ідзе да прылаўкаў).**

**Вядучы**. Глядзіце, колькі цудоўных восеньскіх букетаў! Трэба песню пра восень заспяваць!

**Песня "Залатая завіруха", муз.я.жабко**

**Вядучы**. А вось цудоўныя рушнікі!

На ручніках і на сурвэтках
Палыхаюць ружы-кветкі.
Тут і пеўнікі, і гусі,
Вышывала іх бабуся.
Чараўніца наша бабка –
Аж здіўляецца Агатка.
Возьме ў рукі палатно –
Ажывае ўраз яно.

**Пазнаёмцеся з вырабамі майстэрства Трошка Наталлі Міхайлаўны.**



**Танец (бел.нар.песня "Купалінка")**




**Вядучы**. А вось якая рэдзька ўрадзіла!
**Гульня "Рэдзькі"** -
з'яўляецца дзяўчынка з латком дзяўчынка.
Каму стужкі шаўковыя, разнакаляровыя.
Ёсць чырвоны паясок і прыгожы грабяшок!
Ці я ў мамкі не дачка? Ці я не дачушка?
Руса косанька мая, а ў касе і стужка.
**Вядучы**. Адкуль такая весялушка?
**Дзяўчынка**. 3 Вясёлкі.
**Вядучы**. А чыя ты?
**Дзяўчынка**. Васіля.
**Вядучы.** А як завешся?
**Дзяўчынка.** Ганусся.
**Вядучы**. А што робіш?

**Дзяўчынка**. Смяюся!
**Вядучы**. Ну пакажы свой паясок!
Вельмі ж прыгожы!
За колькі грошай прадаеш?
**Дзяўчынка**. А я дарма аддаю, людзей весялю. (Раздае музычныя інструменты)
**Песня "Зайграй жа мне, дударочку"**
**Вядучы**. Завітала восень у наш край,
Усім радасць прынесла - добры ўраджай!
**Прыпеўкі** –
**1-е дзіця**.
На гародзе ў гаспадыні
Многа морквы і цыбулі,
Памідораў, агуркоў,
Часнаку і буракоў.
**2-е дзіця**. Ад стараннай працы
Выраслі на градцы
Вось такія буракі!
Вось такія агуркі!
А капусты качаны

Вось такой велічыні!

**3-е дзіця**.

Добрая наша гаспадыня.
Любіць кожную расліну.
Пасеяла яна ў полі
І пятрушку, і фасолю.

Несцерка! Несцерка прыйшоў!

**Несцерка**:-Добры дзень , сябры-браточкі!
Эге, колькі вас тут сабралася!
Не раўнуючы, як дроў у лесе.
Ой, прабачце, можа, каго абразіў?
Не, не, як кветак у полі!

**Гаспадар**: -Праходзь, праходзь, Несцерка

**Несцерка**:- Ой вясёлае сёння свята, і гасцей тут вельмі багата

**Адзін з гасцей**: -Ну, Несцерка, раскажы, дзе быў, што чуў?

**Несцерка**:-О! Дзе я толькі не быў? Нават у самой Масковіі пабываў.

**Мужчына**: -Ідзі ты, нябось брэшаш?

: -Брэшаш, брэшаш, Несцерка!

**Несцерка**: -От яшчэ будуць пярэчыць. А ведаеце, як у Масковіі наш боршчык называюць?

**Жанчыны:**- Як?

**Несцерка:** -Первое (расцяжна)

**Адзін з гасцей**:- Несцерка, яшчэ што-небудзь раскажы

**Несцерка**: -Гэта ў Дзвіжках было. Іду я па вуліцы, бачу: хлапчук вядзе на вяроўцы цяля, якое кідалася ва ўсе бакі. А тут якраз ураднік праязджаў.

-Ты чаму перада мною шапкі не здымаеш, хам?!—закрычаў ён на хлопца.

-Калі ж мае рукі заняты, пане ўраднік. Злезце, калі ласка, з воза, патрымайце цяля, а я шапку здыму.

Усе смяюцца.

**Адзін з гасцей: -**А ці не ў гэтай вёсцы мужык на вяроўцы зацягнуў цяля на хлеў у галодны год, каб жыта, якое прарасло, паела,? А яно і задушылася.

**Несцерка**: -У гэтай, у гэтай. Там і такое было: адзін дзівак падпаліў сабаку хвост і пусціў у бок возера, а ён, ашалелы, пабег у вёску—палову сяла спаліў.

**Мужчына:** -Ёсць жа дзівакі на свеце!

**Несцерка:**- А я вось у Поразаве быў. Там вось у такую гульню моладзь гуляла. А ну, станавіцеся ў круг. Навучу. Вось яблычак. Трэба яго, трымаючы пад барадою, перадаць другому. Зразумелі? Але хто ўпусціць, той будзе цалавацца. Ну, пачынаем. (гульня праходзіць пад музыку бубна ці пад свісцёлкі).

(Нечакана з'яўляецца "конь", за ім бяжыць Лявон, спрабуе спыніць яго)

**Лявон**. Тпру- тпру! Як пачуў мой конь музыку, дык і пабег сюды. Вельмі ж танцаваць любіць. Ой, а дзе ж гэта я?

**Вядучы.** У школе на кірмашы. Запрашаем да нас.

**Лявон**. Ой. А мы не прывіталіся! Добры дзень, дзеткі! Добры дзень, госці дарагія!

(Забягае Лявоніха)

**Лявоніха**. Вітаю вас, людзі добрыя! А Лявона майго вы не бачылі?

**Лявон**. Ды я даўно ўжо тут. Паглядзі, які багаты тут кірмаш. Як у казцы - з рога ўсяго многа!

Ёсць і цацкі, і ласункі -Усім будуць падарункі.

**Лявоніха** (аглядваецца навокал). І праўда, усяго многа. Трэба і сабе тавар наглядзець

( падыходзіць да прылаўка).

**Гаспадыня**. Прадам чаравічкі - зусім невялічкі!

**Лявоніха**. Ой, якраз такія, як мне падабаюцца. Лявон, галубчык, не скупіся, купі мне чаравічкі.

**Лявон**. Ну, што з табою зробіш? Трэба купіць.

**Лявоніха.** Гэй, музыка, грай, Жару паддавай! Зробім круг вялікі, Скачуць самі чаравікі!

**Танец "Каціласся чорная галка", бел.нар. мел. (Лявон з Лявоніхай танцуюць з дзецьмі).**

**Лявоніха**. Вось як добра танцавалі
І нікольки не стаміліся

**Лявон**. Трэба нам ужо ў дарогу.
Дзякуй, госці, за падмогу!
Вы так дружна рагаталі,
Нас так хораша віталі,
Пляскалі ў ладкі,
Адгадвалі загадкі!

**Жытнёвы каласок**. Хоць шкада, а ўсё ж - бывайце!
Толькі нас не забывайце!
Дружна жывіце!
Хутка расціце!




**Лявоніха**. Край свой любіце
Не таму любіце, што за ўсё цяплейшы,

А таму любіце,
Што за ўсё мілейшы,
За ўсё прыгажэйшы!

**Вядучы.**

Надыходзіць смутны час –
Пара нам развітацца.
Але просім шчыра вас
Зноў к нам завітацца.
Будзем рады мы сябрам,
Пачастуем ласкай.
Няхай свеціць сонца вам,
Як у добрай казцы!

(Гучыць беларуская танцавальная мелодыя. Усе танцуюць).